5. Российский государственный исторический архив (далее – РГИА). – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740.

6. Дневники императора Николая II / под ред. К. Ф. Шацилло. – М.: Орбита, 1991. – 736 с.

7. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 789.

8. Справочник для абонентов телефонной сети Штаба Верховного Главнокомандующего. – Могилев: Тип. Штаба Верховного Главнокомандующего, 1916. – 102 с.

9. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 815.

**(Дата подачи: 21.02.2022 г.)**

*А. Р. Раюк*
ТАА «БурВодСецьˮ»,  Мінск

*A. Rayuk*
BurVodSet LLC, Minsk

**УДК 94(476) «1905/1908»**

# ЭВАЛЮЦЫЯ ПРАСТОРАВЫХ МЕЖ «КРАЯ» У ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАГРАМАХ КРАЁЎЦАЎ-КАНСЕРВАТАРАЎ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ Ў 1905–1908 ГГ.

# THE EVOLUTION OF THE SPATIAL BOUNDARIES OF THE «COUNTRY» IN THE POLITICAL PROGRAMS OF THE CONSERVATIVE KRAJOWCY OF BELARUS AND LITHUANIA IN 1905–1908

*У артыкуле высвятляецца, як недаацэнка інтарэсаў праваслаўнага насельніцтва левабярэжнай Украіны і пазіцыя краёўцаў-дэмакратаў паўплывалі на звужэнне пачатковых прасторавых меж «края» у палітычных праграмах краёўцаў-кансерватараў Беларусі і Літвы ў 1905–1908 гг.*

*Ключавыя словы: краёвасць; беларускі палітычны кансерватызм; палітычная гісторыя Беларусі; Краёвая партыя Літвы і Беларусі; Эдвард Вайніловіч; Дзяржаўная Дума Расійскай Імперыі.*

*The article reveals how the underestimation of the interests of the Orthodox population of Left-Bank Ukraine and the position of the Democratic Krajowcy influenced the narrowing of the initial spatial boundaries of the «country» in the political programs of the conservative Krajowcy of Belarus and Lithuania in 1905–1908.*

*Keywords: the Krajowcy; Belarusian political conservatism; political history of Belarus; Regional Party of Lithuania and Belarus; Edward Voinilovich; the State Duma of the Russian Empire.*

Рух краёўцаў займае вялікі адрэзак часу ў гісторыі Беларусі – з 1905 г., калі «краёўцы» пачалі адкрыта публікаваць свае палітычныя пра-

грамы і рабіць канкрэтныя крокі па рэалізацыі сваіх ідэй, да 1921 г., калі быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор, які канчаткова перакрэсліў усе планы захавання адміністрацыйна-тэрытарыяльнага адзінства беларуска-літоўскага «края», – і быў маштабнай і складанай з’явай.

Калі апісанне і ацэнка руху краёўцаў ужо даўно знайшлі сваё месца ў польскай (З. Юндзіл, Я. Савіцкі, Я. Юркевіч, Р. Юркоўскі, Д. Шпопер, Д. Тарасюк і інш.) і літоўскай гістарыяграфіі (З. Кяўпа, Р. Мікныс), то ў беларускай першапачаткоўцам стаў А. Смалянчук, хоць свае ацэнкі ўносяць і іншыя беларускія даследчыкі (А. Латышонак, С. Мянчэня, А. Унучак, А. Ластоўскі, А. Раюк і інш.) [1–4].

«Краёвая канцэпцыя» («краёвая ідэя») не мела адзінага канкрэтнага аўтара, а нарадзілася ў выніку дыскусіі самых актыўных прадстаўнікоў карэннага маянтковага дваранства і інтэлігенцыі Беларусі і Літвы. Сярод краёўцаў вылучылася два кірункі (ліберальна-кансерватыўны і ліберальна-дэмакратычны), але краёвая канцэпцыя была супольнай ідэяй як для кансерватыўнай, так і дэмакратычнай плыні краёўцаў. Розніца паміж кансерватыўным і дэмакратычным кірункамі была не ў канечнай мэце (росквіт свайго беларуска-літоўскага края, раўнапраўе народаў, грамадская талерантнасць і супрацоўніцтва), а ў мадэлі пераўтварэнняў на выклікі паўсталых для края праблем і ў метадах дасягнення гэтай мэты.

У дадзеным артыкуле мы высветлім прычыны эвалюцыі прасторавых меж «края» у палітычных праграмах краёўцаў-кансерватараў Беларусі і Літвы ў 1905–1908 гг., бо гэты важны аспект «краёвай канцэпцыі» пакуль не быў прадметам навуковага даследавання і не быў асэнсаваны гісторыкамі.

Па прычыне адсутнасці ў «Заходнім краі» Расійскай Імперыі земстваў карэнныя (галоўным чынам, каталіцкія і польскамоўныя) дваране, пачынаючы з 1880-х гг., пачалі згрупоўвацца ў сваіх губернях у сельскагаспадарчыя таварыствы, якія ўзначальваліся прызнанымі аўтарытэтнымі маянткоўцамі і былі ўплывовымі арганізацыямі ў губернях. У хуткім часе, акрамя гаспадарчых (камерцыйных), многія сельскагаспадарчыя таварыствы ў «заходніх губернях» пачалі выконваць і грамадскія функцыі (культурныя, навуковыя, адукацыйныя і г. д.), характэрныя для земстваў, а сядзібы таварыстваў сталі важнымі цэнтрамі грамадскага жыцця губерняў. Лідары сельскагаспадарчых таварыстваў па сутнасці сталі неафіцыйнымі лідарамі карэнных дваран Заходняга края. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі (МТСГ) было самым моцным і самым буйным па колькасці членаў і фактычна цэнтральным у Паўночна-Заходнім краі, на якое ў сваіх дзеяннях аглядаліся іншыя сельскагаспадарчыя таварыствы ў паўночна-заходніх губернях. Асоба доўгачасовага віцэ-старшыні МТСГ Э. Вайніловіча, які па сутнасці быў неафіцыйным кіраўніком МТСГ, была шырока вядомай у Заходнім краі (які мясцовыя дваране паралельна называлі ў сваім коле як «Літва і Русь»), а так-

сама мела высокі аўтарытэт як сярод карэнных дваран у Мінскай губерні, так і ў іншых беларуска-літоўскіх губернях [3, с. 29–30].

У час ліберальна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1905–1907 гг. у Расійскай Імперыі грамадскі рух патрабаваў ад цара ўвядзення прагрэсіўных рэформ, у першую чаргу – увядзення ліберальных свабод і заканадаўчага парламента, што было даўно неабходным. Першапачаткова пад націскам рэвалюцыйных выступленняў расійскі імператар Мікалай II выдаў маніфест ад 6 жніўня 1905 г., якім уводзіў у Расійскай Імперыі законадарадчую Дзяржаўную Думу і аб'яўляў выбары ў гэтую ўстанову.

Тэрыторыя Заходняга края была часткай былой Рэчы Паспалітай, дзе ў пачатку XX ст. (асабліва ў Паўночна-Заходнім краі) яшчэ значным быў працэнт карэннага дваранства. Карэнныя (галоўным чынам, польскамоўныя і каталіцкія) дваране літоўска-беларускіх губерняў былі генетычна нашчадкамі шляхты ВКЛ і лічылі сябе спадкаемцамі яго гісторыі і традыцый. У сваім коле яны менавалі сваю зямлю «Літвой» (ці «землямі былога Вялікага Княства Літоўскага»), бо перадавалі ад пакалення да пакалення праз усё XIX ст. мару адраджэння былой федэратыўнай польска-літоўскай Рэчы Паспалітай. Выступаючы за салідарнасць з дваранамі з польскіх губерняў (так званыя «Кангрэсоўкі»), дваране Паўночна-Заходняга края (Віленская, Ковенская, Гродзенская, Мінская, Віцебская і Магілёўская губерні) адчувалі, што ў Расійскай Імперыі ў іх больш падобнага па юрыдычным статусе існавання (галоўным чынам, абмежавальнага і дыскрымінацыйнага па сваім характару) з польскімі дваранамі Паўднёва-Заходняга края (Кіеўская, Валынская і Падольская губерні). У дваран Паўднёва-Заходняга края традыцыі самастойнасці і незалежнасці ад варшаўскага цэнтра былі значна слабейшыя, бо тэрыторыя паўднёва-заходніх губерняў да падзелаў Рэчы Паспалітай уваходзіла ў склад ваяводстваў Польскага Каралеўства і мясцовае каталіцкае дваранства было ў сваёй большасці этнічна польскім. Карэнныя ж дваране Паўночна-Заходняга края (фактычна зямель былога ВКЛ) лічылі, што жывуць у цэнтры сваёй радзімы, іх уласнага края, а не абрэзка ці ўскраін («крэсаў») якойсьці ўсяпольскай супольнасці [5, с. 235]. Выкарыстоўваючы старую геаграфічную тэрміналогію часоў Рэчы Паспалітай, карэнныя дваране Заходняга края («Літвы і Русі») пад «Літвой» разумелі Ковенскую, Віленскую, Гродзенскую і Мінскую губерні, а пад «Руссю» – усе астатнія (Віцебскую, Магілёўскую, (часам Мінскую), Кіеўскую, Валынскую і Падольскую губерні). У рамках «Русі» Віцебская і Магілёўская губерні (а часам і Мінская) імі менаваліся як «Белая Русь», хоць назва «Беларусь» усё часцей пераносілася і на Гродзенскую і палову Віленскай губерні.

Адсюль натуральнай была ідэя супрацоўніцтва ў Дзяржаўнай Думе паміж дэпутатамі ад карэнных дваран заходніх губерняў. Амаль адразу пас-

ля выдання маніфеста ад 6 жніўня 1905 г. Э. Вайніловіч напісаў 16 жніўня ліст да М. Здзяхоўскага, у якім выказваўся, што дэпутаты, выбраныя з ліку карэнных дваран Заходняга края, павінны іграць адметную ролю ў Думе, бо Заходні край («Літва і Русь») мае свае інтарэсы; і сцвярджаў, што яны могуць быць пасрэднікамі паміж групай дэпутатаў ад польскіх губерняў («Польскае Кола») і іншымі дэпутатамі заходніх губерняў [6, с. 212]. Лідары Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (Э. Вайніловіч, Е. Чапскі, Г. Друцкі-Любецкі, Р. Скірмунт і інш.), усведамляючы сваю грамадскую ролю ў краі і свой уплыў, вырашылі актыўна рыхтавацца да чаканых выбараў у новы дзяржаўны орган і першымі сярод лідараў іншых сельскагаспадарчых таварыстваў сфармулявалі на сходзе МТСГ у Мінску палітычную праграму з 12 пунктаў, апублікаваную 7 кастрычніка 1905 г. на старонках газеты «Kuryer Litewski» [7].

Праграма стала адной з першых праяў практычнай рэалізацыі ідэй «краёвасці» – яе ліберальна-кансерватыўнага кірунку – і пастулявала аўтанамісцкія, інтэрнацыянальныя і ліберальна-кансерватыўныя прынцыпы: раўнапраўе ўсіх народаў; прынцыпы свабоды сумлення, веравызнання, слова, стварэння грамадскіх арганізацый і сходаў; раўнапраўе жанчын; недатыкальнасць асобы і жытла без рашэння суда; усеагульная роўнасць перад законам; свабода навучання на роднай мове; ліквідацыя пашпартнай сістэмы ўнутры імперыі і ліквідацыя мяжы яўрэйскай аселасці. Акрамя таго палітычная праграма МТСГ патрабавала ўвядзення ўсеагульнай і бясплатнай пачатковай адукацыі, што, на думку лідараў МТСГ, было важным для павышэння дабрабыту і заможнасці сялян і знішчэння ўвогуле саслоўных адрозненняў сялян. Дзеячы МТСГ былі праціўнікамі сацыялістычных ідэй (у першую чаргу – ідэі ліквідацыі права прыватнай уласнасці), таму ў сваёй праграме акцэнтавалі ўвагу на неабходнасць вырашэння праблемы недахопу зямлі ў сялян, але падкрэслівалі, што гэта праблема павінна вырашацца без парушэння права прыватнай уласнасці на зямлю. У палітычнай сферы праграма патрабавала рэарганізацыі Дзяржаўнага Савета і рэарганізацыі Дзяржаўнай Думы з законадарадчай у законадаўчую, пашырэння праў для прадстаўніцтва грамадзян (пашырэнне кола выбаршчыкаў), увядзенне аўтаноміі Заходняга края. Сама апублікаваная палітычная ліберальна-кансерватыўная праграма МТСГ была распрацавана для прадстаўлення яе на земскім сходзе і была ў многіх пунктах сугучна з тымі патрабаваннямі, якія прад’яўляў расійскаму самаўладдзю агульнарасійскі ліберальны рух у ходзе рэвалюцыі [2, с. 240–241; 3, с. 62–67].

Рэвалюцыйны грамадскі ўздым у Расійскай Імперыі дабіўся таго, што расійскі імператар Мікалай II пасля Кастрычніцкай стачкі быў вымушаны выдаць Маніфест 17 кастрычніка 1905 г., які надаваў аб’яўленай раней законадарадчай Дзяржаўнай Думе (у якую яшчэ не прайшлі выбары дэпутатаў) законадаўчы характар і ўводзіў ліберальныя свабоды (свабоды арганізацый,

сходаў, слова і інш.). 11 снежня 1905 г. расійскім імператарам было прынята новае палажэнне аб выбарах у Дзяржаўную Думу, якое значна пашырала (у адрозненне ад маніфеста 6 жніўня 1905 г.) кола выбаршчыкаў, хоць сама працэдура выбару была двухступнёвай: выбаршчыкі выбіралі прадстаўнікоў у чатырох курыях (памешчыцкай, гарадской, сялянскай і рабочай).

20 лютага 1906 г. некалькімі нарматыўнымі актамі расійскі імператар Мікалай II увёў змены структуры і прынцыпаў функцыянавання Дзяржаўнага Савета, які станавіўся верхняй палатай парламента, дэпутаты якой выбіраліся на губернскіх земскіх і дваранскіх сходах, сходамі купцоў, прамыслоўцаў і прадстаўнікоў праваслаўнай царквы. Прыгатаванні карэнных дваран Заходняга края да выбараў у Думу і Савет адразу з лістапада 1905 г. суправаджаліся дыскусіяй аб будучай стратэгіі дзеянняў у гэтых установах. Адначасова было вырашана, што неабходна стварыць дзве асобныя групы (колы) дэпутатаў як у Думе, так і Савеце – адна група ад «заходніх губерняў», другая – ад польскіх. Будучым дэпутатам прапаноўвалася адмовіцца ад стварэння выключна «польскага» блока і згрупавацца з іншымі групамі дэпутатаў (у першую чаргу – заходніх і ўласна польскіх губерняў) для стварэння кааліцыі [2, с. 242; 3, с. 62–67].

Лідары сельскагаспадарчых таварыстваў Заходняга края вырашылі балаціравацца ў верхнюю палату парламента (Дзяржаўны Савет), якая была больш прэстыжнай палатай, а менш уплывовыя (і маладзейшыя) члены таварыстваў – у ніжнюю (Дзяржаўную Думу). Па сутнасці было загадзя вядома, што ў Дзяржаўны Савет дэпутатам ад Мінскай губерні мясцовымі дваранамі будзе выбраны Э. Вайніловіч. Для выбараў у Дзяржаўную Думу з мэтай аб'яднаць усіх прадстаўнікоў, якія б непасрэдна выказвалі інтарэсы карэнных народаў Заходняга края, было вырашана стварыць «краёвую» партыю.

17 лістапада 1905 г. Р. Скірмунт ад імя кола ўплывовых лідараў МТСГ апублікаваў у газеце «Kuryer Litewski» «Адозву Краёвай партыі Літвы і Русі». На першапачатковым этапе свайго развіцця «краёвасць» у краёўцаў-кансерватараў была ідэяй аб'яднаць сілы прыхільнікаў развіцця і росквіту ўсяго Заходняга края (Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай губерняў) як адзінага цэлага. Адозва спасылалася на праграму МТСГ, згаджаючыся з ёй, і пашырала яе пастулаты: шырокае самакіраванне Заходняга края («Літвы і Русі»), палягчэнне сялянам атрымання банкаўскіх крэдытаў на куплю зямлі і паднясце культуры сельскай гаспадаркі ва ўласнай гаспадарцы. Адозва ўхваляла і падтрымлівала рэформу дзяржаўнага ладу Расійскай Імперыі, акрэсленага ў Маніфесце 17 кастрычніка 1905 г. Ухваляла таксама ініцыятывы расійскіх дзяржаўных дзеячаў, накіраваных на «рэфармаванне дзяржаўнага ладу ў духу талерантнасці, свабоды і прагрэсу», развіццё агульначалавечых, палітычных і канстытуцыйных свабод – г. зн. технатва-

рэння Расійскай Імперыі ў канстытуцыйную манархію. Заклікала таксама да стварэння ў будучай Думе асобнага Краёвага кола Літвы і Русі, якое павінна ў сваёй працы звяртацца да дасягненняў, каб у духу хрысціянскай этыкі захоўваць прынцыпы мірнага суіснавання народаў, жывучых у Заходнім краі. Падкрэслівалася таксама, што для рэалізацыі гэтай мэты паміж дваранствам і сялянствам «павінна і можа панаваць поўная згода ў грамадскай і палітычнай працы пад лозунгам агульнага дабра супольнай айчыны» [8].

Вядома, што ідэя аўтаноміі «Літвы і Русі» ў рамках Расіі прапаноўвалася яшчэ ў 1810–1811 г., а паўстанні 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг. увогуле былі за аднаўленне дзяржаўнай самастойнасці зямель былой Рэчы Паспалітай. Выкарыстанне геаграфічнай тэрміналогіі Рэчы Паспалітай і вылучэнне Заходняга края як тэрыторыі дзеяння для краёўцаў-кансерватараў было зваротам да мінулага і імкненнем кансалідаваць мясцовае насельніцтва (дваран і сялян рознай этнічнай прыналежнасці) менавіта ў гэтых геаграфічных рамках [9]. На наш погляд, галоўнай праблемай гэтых разлікаў было тое, што краёўцы-кансерватары адасаблялі тэрыторыю Паўднёва-Заходняга края, дзе пераважала ўкраінскае сялянства, ад іншых губерняў з пераважна ўкраінскім сялянскім насельніцтвам – Чарнігаўскай, Харкаўскай, Палтаўскай, Кацярынаслаўскай, Херсонскай і Таўрычаскай губерняў. З часоў падзелаў Рэчы Паспалітай украінцы здолелі за XIX ст. каланізаваць землі так званай «Наваросіі» (Кацярынаслаўская, Херсонская і Таўрычаская губерні), сфарміраваць свае ўласныя планы па стварэнні асобнай аўтаноміі ў складзе Расіі (ці дзяржаўнасці), якія актыўна імкнуліся ажыццявіць украінская інтэлігенцыя і значная частка мясцовых дваран (як нашчадкаў былой праваслаўнай казацкай старшыны, так і «хлапаманаў» з ліку каталіцкай польскай шляхты). Акрамя таго, паводле першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва (1897) Расійскай Імперыі ў Паўднёва-Заходнім краі землеўласнікі-палякі з-за актыўнай урадавай антыпольскай зямельнай палітыкі складалі ўжо толькі 18 % ад агульнай колькасці маянткоўцаў у параўнанні з ранейшымі 90 % у пачатку 1860-х гг.; а «рускія» землеўласнікі ў 1897 г. там складалі 70 % маянткоўцаў. У Беларусі і Літве колькасць землеўласнікаў, якія менавалі сябе «палякамі», скарацілася з 94 % ад агульнай колькасці маянткоўцаў у 1860-я гг. толькі да 51 % у 1897 г. і прадстаўлялі сабой адносную большасць; а «рускія» землеўласнікі ў 1897 г. складалі 45 % [4, с. 46; 10, с. 222–223; 11, с. 79, 127–128].

Чарговая, утрыманая ў ліберальна-кансерватыўным тоне «Адозва Краёвай партыі Беларусі і Літвы», якую таксама прыслаў Р. Скірмунт, была надрукавана 11 студзеня 1906 г. у газеце «Kuryer Litewski» і заклікала да стварэння «Краёвай партыі Беларусі і Літвы». Лідары МТСГ ужо акрэслівалі тэрыторыю для дзеяння новай партыі толькі літоўска-беларускімі губернямі (Ковенская, Віленскай, Гродзенская, Мінская, Віцебская і Магілёўская губерні). Прычынай выключэння Кіеўскай, Валынскай і Падольскай

губерняў з планаў дзеяння «краёвай партыі» былі разгорнутыя на «поўдні Расіі» (гэта значыць на Украіне) украінскімі сялянамі шматлікія пагромы маёнткаў землеўласнікаў-палякаў у ходзе рэвалюцыі 1905–1907 гг. у Расійскай Імперыі. У адозве Скірмунтам тлумачылася, што падбухторнікамі пагромаў былі сацыялістычныя партыі, а віноўнікамі – лібералы-кадэты, якія ўхвалялі пераход часткі зямель маянткоўцаў да малазямельных сялян: «Для атрымання падтрымкі натоўпаў заахвочвалі малазямельных да знішчэння і рабунку чужой маёмасці на вёсцы. Крык жаху і роспачы разышоўся на ўвесь цывілізаваны свет пасля звестак аб саромных пагромах капіталістаў і купцоў у некаторых гарадах паўднёвай Расіі. Крык жаху з грудзі людзей, якія самі свядома пачыналі аграрны пажар» [12].

Толькі пазней ананімны аўтар пад крыптонімам «Samotny» у артыкуле «Сканфедэраваныя тры колы», апублікаваным у газеце «Kuryer Litewski» 24 красавіка 1906 г., прапанаваў стварыць у Дзяржаўнай Думе кааліцыю з трох дэпутацкіх кол: Кола Каралеўства Польскага; Кола Літвы і Беларусі; і Кола Украіны (з усіх украінскіх земляў – разам з «Задняпроўем») [13].

Абвастрэнне адносін (прычым не толькі на маёмаснай глебе, але і этнічнай) паміж украінскім сялянствам і польскімі маянткоўцамі ў Паўднёва-Заходнім краі рабіла немагчымым супрацоўніцтва на аснове «краёвай ідэалогіі» кансерватыўнага кірунку, што, у прынцыпе, можна было чакаць загадзя. У адрозненне ад украінскіх зямель, «краёвая ідэя» атрымала ў 1905–1906 гг. вялікі водгук і аказалася запатрабавальнай у Беларусі і Літве. Пачатку вялікай дыскусіі адносна праблем і супольнай будучыні літоўска-беларускіх губерняў, а таксама ўзаемаадносін мясцовых народаў спрыяла фармаванне побач з ліберальна-кансерватыўным ліберальна-дэмакратычнага кірунку «краёвасці», што стала прычынай атрымання «краёвай канцэпцый» новых граняў і яе шырокага распаўсюджання ў грамадскай палеміцы Беларусі і Літвы.

Такім чынам, у пачатковай палітычнай праграме краёўцаў-кансерватараў Беларусі і Літвы ў 1905–1908 гг. прасторавымі межамі «края» была тэрыторыя дзевяці заходніх губерняў (Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай), якая да 1772 г. уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, што было праявай звароту мясцовага каталіцкага дваранства да гістарычнай традыцыі былой Рэчы Паспалітай і імкнення аднавіць ранейшае адміністрацыйна-тэрытарыяльнага адзінства гэтых зямель – хоць бы ў форме аўтаноміі ў рамках Расійскай Імперыі. Калі ідэі пашырэння грамадзянскіх правоў і ўмеранай ліберальнай эканамічнай мадэрнізацыі края, агучаныя ў палітычнай праграме краёўцаў-кансерватараў, былі навацыяй для палітычнай думкі Беларусі і Літвы, то ідэі аўтаноміі, традыцыйнай талерантнасці і кампраміса ў моўных і этнічных узаемаадносінах такой навацыяй у пачатку XX ст. не былі.

Першапачатковая арыентацыя краёвай канцэпцыі на прастору «заходніх губерняў» (па прычыне таго, што ў іх быў значны працэнт мясцовага каталіцкага дваранства) была відавочным анахранізмам і недаацэнкай інтарэсаў праваслаўнага насельніцтва левабярэжнай Украіны. Ідэі краёвасці не атрымалі зацікаўленасці і водгуку ва ўкраінскіх губернях, аднак «краёвая ідэя» аказалася запатрабавальнай у беларуска-літоўскіх губернях Расійскай Імперыі: у пачатку 1906 г. побач з ліберальна-кансерватыўным кірункам краёвасці пачаў фармавацца яшчэ адзін – ліберальна-дэмакратычны кірунак. Менавіта краёўцы-дэмакраты прапагандавалі рэалізацыю ідэі краёвасці выключна ў межах шасці беларуска-літоўскіх губерняў, на што краёўцы-кансерватары згадзіліся ў 1907–1908 гг.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Jurkiewicz, J.* Rozwój polskiej myśli politycznej na Litwie i Białorusi w latach 1905–1922 / J. Jurkiewicz. – Poznań: UAM, 1983. – 259 s.

2. *Szpoper, D.* Gente Lithuana, Natione Lithuana. Myśl polityczna i działalność Konstancji Skirmuntt (1851–1934) / D. Szpoper. – Gdańsk: Arche, 2009. – 487 s.

3. *Szpoper, D.* Sukcesorzy Wielkiego Księstwa. Myśl polityczna i działalność konserwatystów polskich na ziemiach litewsko-białoruskich w latach 1904–1939 / D. Szpoper. – Gdańsk: Arche, 1999. – 357 s.

4. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.

5. Dzieje Kresów / L. Korczak [i in.]; wstęp.: A. Nowak. – Kraków: Kluszczyński, 2006. – 352 s.

6. *Jurkowski, R.* Listy Edwarda Woyniłłowicza do Mariana Zdziechowskiego z lat 1905–1928, Cz. I. / R. Jurkowski // Echa Przeszłości. – Olsztyn: Uniwersytet Warmińsko-Mazurski w Olsztynie, 2007. – Nr. VIII. – S. 209–220.

7. Przed wyborami // Kuryer Litewski. – 1905. – № 31. – S. 1.

8. Odezwa Stronnictwa Krajowego Litwy i Rusi // Kuryer Litewski. – 1905. – № 65. – S. 1–2.

9. *Woyniłłowicz, E.* Koło Polskie / E. Woyniłłowicz // Kuryer Litewski. – 1906. – № 80. – S. 2.

10. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. / А. П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003. – 233 с.

11. *Rodkiewicz, W.* Russian Nationality Policy in the Western Provinces of the Empire (1863–1905) / W. Rodkiewicz. – Lublin: Scientific Society of Lublin, 1998. – 257 s.

12. Odezwa Stronnictwa Krajowego Białej Rusi i Litwy // Kuryer Litewski. – 1906. – № 7–8. – S. 2.

13. Samotny. Skonfederowane trzy koła / Samotny // Kuryer Litewski. – № 88. – 1906. – S. 1.


**(Дата падачы: 24.02.2022 г.)**